# СОДЕРЖАНИЕ


Як правільна вымаўляць і чытаць па-беларуску . . . . . 3

Асноўныя правілы па беларускай мове
за курс пачатковай школы . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

СЛОЎНІКАВАЯ СКАРБОНКА . . . . . . . . . . . . . . . . . 42
1. Тэма: Словы і звароты ветлівасці . . . . . . . . . . 42
2. Тэма: Чалавек. Часткі цела . . . . . . . . . . . . . . 44
3. Тэма: Дзеянне і стан чалавека . . . . . . . . . . . . 45
4. Тэма: Адзенне і абутак . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
5. Тэма: Посуд. Прыгатаванне ежы . . . . . . . . . . 47
6. Тэма: Кветкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
7. Тэма: Лес. Дрэвы. Грыбы. Ягады . . . . . . . . . . 50
8. Тэма: Дзікія звяры і птушкі . . . . . . . . . . . . . 51
9. Тэма: Гаспадарка. Свойскія жывёлы
і птушкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52
10. Тэма: Рыбы. Насякомыя . . . . . . . . . . . . . . . . 53
11. Тэма: Поры года. Назвы месяцаў.
Дні тыдня. Надвор’е . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
12. Тэма: Дом. Кватэра. Вуліца.
Дарога. Транспарт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

## ЯК ПРАВІЛЬНА ВЫМАЎЛЯЦЬ І ЧЫТАЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ

**1.** Галосныя ***о*** і ***э*** заўсёды пад націскам:
увóсень, шэ́пчуць.

**2.** ***Д*** вымаўляецца толькі цвёрда, а ***дз*** — толькі мякка: і***д***у — і***дз***е.
***Т*** вымаўляецца толькі цвёрда, а ***ц*** — толькі мякка: жы***т***а — у жы***ц***е.
***Р*** і ***ч*** вымаўляюцца цвёрда: ве***ч***а***р***.

**3.** [***ў***] чытаецца хутка, не працяжна: пра***ў***да.

**4.** Зычны [***г***] вымаўляецца працяжна, як [***х***].

**5.** Замест [***щ***] (*рус.*) вымаўляюць [***шч***]: пло***шч***а.

**6.** Замест ***ъ*** (*рус.*) ставіцца [’] (апостраф): сям’я.

**7.** Глухія (***п***, ***т***, ***х***, ***с***, ***ц’***, ***ш***, ***ч***) перад звонкімі зычнымі вымаўляюцца звонка:

| пішам | чытаем |
|---|---|
| ка***сь***<u>б</u>а | ка***зь***ба |
| про***сь***<u>б</u>а | про***зь***ба |

А звонкія перад глухімі зычнымі і ў канцы слова — глуха:

| пішам | чытаем |
|---|---|
| ду***б***кі | ду***п***кі |
| мядзве***дз***ь | мядзве***ц***ь |
| сне***г*** | сне***х*** |

**8.** Словы ***не*** і ***без*** заўсёды пішуцца праз літару ***е***, але перад націскным складам чытаюцца як з літарай ***я***:

| пішам | чытаем |
|---|---|
| не ба́чу | н***я*** бачу |
| не хо́дзіць | н***я*** ходзіць |
| без мо́ра | б***я***з мора |
| не *трэ́*ба | н***я*** трэба |

**9.** У беларускай мове свісцячыя ***з***/***с***, ***дз’***/***ц’*** перад мяккімі зычнымі вымаўляюцца мякка:

| пішам | чытаем |
|---|---|
| ***с***нег | с***ь***нег |
| ***з***мерзнуць | з***ь***мерзнуць |

**10.** Прыназоўнік (предлог) ***з*** чытаецца як ***с***, калі слова пачынаецца з глухога зычнага:

| пішам | чытаем |
|---|---|
| ***з* к**нігі<br>↓<br>глухі | ***с*** кнігі |
| ***з* р**аніцы<br>↓<br>звонкі | ***з*** раніцы |

**ЗАПОМНІЦЕ!**

| | чытаем | |
|---|---|---|
| ***з* + *ч*** → | ***ш*** | чалавекам |
| ***з* + *ж*** → | ***ж*** | жыцця |
| ***з* + *ш*** → | ***ш*** | шышкі |

**11.** Некаторыя спалучэнні зычных таксама чытаюцца і пішуцца па-рознаму: свісцячыя ***з***, ***с***, ***дз***, ***ц*** перад шыпячымі ***ж***, ***ш***, ***дж***, ***ч*** вымаўляюцца як шыпячыя, і наадварот:

| пішам | | чытаем |
|---|---|---|
| **зж** | → | **жж** |
| зжаваць | | жжаваць |
| **здж** | → | **жж** |
| езджу | | ежжу |
| **сш, зш** | → | **шш** |
| сшытак, з шафы | | шшытак, ш шафы |
| **шс, жс** | → | **сс** |
| слухаешся | | слухаесся |
| **шч, зч** | → | **шч** |
| пясчаны | | пяшчаны |
| **чц** | → | **цц** |
| у печцы | | у пеццы |

**ЗАПОМНІЦЕ!**

| пішам | | чытаем |
|---|---|---|
| ***дч, тч*** | → | ***чч*** |
| лё***тч***ык | | лё***чч***ык |
| ***дц, тц*** | → | ***цц*** |
| у ло***дц***ы | | у ло***цц***ы |

**12.** У беларускай мове ёсць падоўжаныя зычныя, якія чытаюцца працягла:

Пале***сс***е, жы***цц***ё, ры***зз***ё, стаго***ддз***е, каме***нн***е, но***чч***у, збо***жж***а, застрэ***шш***а...

# АСНОЎНЫЯ ПРАВІЛЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ЗА КУРС ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ

**1.** Гукі чуем і вымаўляем, літары пішам.

**2.** Галосныя (гласныя) гукі і літары:

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 галосных гукаў ← | а | о | у | і | ы | э | 10 галосных літар |
| | я | ё | ю | і | ы | е | |

**3.** Зычныя (согласные) гукі:




Няпарныя зычныя гукі:

***л***, ***м***, ***н***, ***р***, ***в***, ***ў***, ***й*** — звонкія;
***к***, ***ф***, ***ц*** — глухія.

## ЗАПОМНІЦЕ!

***и й у*** (*рус.*)

***і й у ў*** (*бел.*)

***в*** / ***ф*** (*рус.*)

няма адпаведнай пары (*бел.*)

***ь*** гука не абазначае

**4.** Беларускі алфавіт

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аа (а) | Бб (бэ) | Вв (вэ) | Гг (гэ) | Дд (дэ) | Дж дж (джэ) | Дз дз (дзэ) |
| Ее (е) | Ёё (ё) | Жж (жэ) | Зз (зэ) | Іі (і) | Йй (і нескладовае) | Кк (ка) |
| Лл (эл) | Мм (эм) | Нн (эн) | Оо (о) | Пп (пэ) | Рр (эр) | Сс (эс) |
| Тт (тэ) | Уу (у) | Ўў (у нескладовае) | Фф (эф) | Хх (ха) | Цц (цэ) | Чч (чэ) |
| Шш (ша) | ы (ы) | ь (мяккі знак) | Ээ (э) | Юю (ю) | Яя (я) | |

## ЗАПОМНІЦЕ!

У беларускай мове ёсць асаблівае спалучэнне літар: ***дж*** і ***дз*** (пры пераносе іх нельга раздзяляць:

ра-***дз***іма, даж-***дж***ы).

**5.** Зацвярдзелыя зычныя:

$\frac{\textbf{ж}}{\textbf{ш}}$, $\frac{\textbf{дж}}{\textbf{ч}}$, **р, ц**

Пасля іх заўсёды пішуцца галосныя:

***а, о, у, ы, э***

ж***о***луд, ч***а***снок, р***ы***ба, р***э***кі.

**6.** З вялікай літары пішуцца:

- імёны, імёны па бацьку, прозвішчы (фамилии) людзей: Алесік, Аляксандраўна, Пятроў;
- клічкі жывёл, птушак: кот Мурзік, папугай Кеша;
- назвы краін, гарадоў, вёсак, вуліц: Беларусь, Мінск, вёска Калінка, вуліца Несцерава;
- назвы мораў, рэк, азёр: Балтыйскае мора, рака Менка, возера Нарач.

**7.** Склад слова.

Колькі галосных — столькі складоў.

| | |
|---|---|
| м***о***р***а*** (1, 2) | мо-ра (1, 2) |
| ***а***кн***о*** (1, 2) | ак-но (1, 2) |
| ***я***н***а*** (1, 2) | я-на (1, 2) |

**8.** Націск — гэта вымаўленне (произношение) аднаго са складоў слова з большай сілай голасу: **кн*і́*га, *е́*лка**

**9.** Перанос слоў.

| | |
|---|---|
| Переноcь па складах: рэч-ка, ноч-чу, мо-ра, аб’-ява. | Адна літара не пакідаецца і не пераносіцца: аса. |
| Спалучэнне ***шч*** можна дзяліць: пло***ш***-***ч***а ці пло-***шч***а. | ***й***, ***ў***, ***ь*** пакідаюць у першай частцы слова: ма***й***-ка, ла***ў***-ка, рэдз***ь***-ка. |
| ***Дж***, ***дз*** не раздзяляюць: ура-***дж***ай. | ***Зычныя*** з ***ь*** складу не ўтвараюць, таму не пераносяцца: цен***ь***. |

**10.** Моцная і слабая пазіцыі зычных гукаў.



**11.** Зычныя ў слабай пазіцыі правярай: змяні слова так, каб пасля гэтага зычнага з’явілася галосная.

Дапамога:

❶ Множны лік:

**зу** $\frac{б}{п}$ → **зуб(ы)**

↓ што пісаць? ↓ з’явілася галосная, **[*б*]** стаў у ***моцную*** пазіцыю

❷ Пакліч слова ласкава:

ука $\frac{з}{с}$ка → **указ(а)чка**

↓ што пісаць? ↓ з’явілася галосная, **[*з*]** стаў у ***моцную*** пазіцыю

3) Калі ❶ і ❷ прыёмы не дапамаглі, глядзі ў ***слоўнік***. Гэта — слоўнікавае слова, яго трэба запомніць:

**ле** $\frac{з}{с}$віца → **ле*с*віца**

↓ што пісаць?